КРАЕВЕДЧЕСКИЙ КЕЙС СОЛИГОРСКА

У начальніка Салігорскага ўчастка Мінскага мантажнага ўпраўлення № 1 І. А. Гольдзіна ён пачаўся з паездкі на Трэці калійны камбінат. На пускавых аб'ектах працуюць і мантажнікі ўчастка. Ілья Аркадзьевіч дэталёва пазнаёміўся з ходам работ, выказаў свае заўвагі. Гэта былі не проста ўказанні, а разумныя парады і пажаданні.

Ілья Аркадзьевіч — даволі вопытны інжынер. Раней ён працаваў на ўчастку прарабам, зарэкамендаваў сябе умелым, адукаваным спецыялістам, які глыбока разбіраецца ў пытаннях вытворчасці. Цяпер т. Гольдзін узначаліў участак і робіць усё ад яго залежачае, каб як найлепш арганізаваць працу людзей. Дарэчы, участак пасляхова выконвае вытворчыя заданні, тут высокая прадукцыйнасць працы.

Інжынер —гэта творчы работнік, які ўмее кіраваць людзьмі, самастойна вырашаць пытанні, звязаныя з вытворчасцю. І вельмі важна выкарыстаць кожную хвіліну рабочага часу з найбольшай карысцю, каб глыбей ведаць становішча спраў на тым ці іншым участку вытворчасці і, разумеецца, унесці свой уклад у агульную справу.

# РАБОЧЫ ДЗЕНЬ ІНЖЫНЕРА

Не любіць заседжвацца ў рабочым кабінеце галоўны інжынер 122-га будаўнічага ўпраўлення Г.В. Бурсаў. Ён часта бывае на аб'ектах, умела вырашае надзённыя справы. Удумлівым, з творчай жылкай спецыялістам паказаў сябе галоўны інжынер БУ-123 М. М. Пікус. Ён многа зрабіў і робіць для ўкаранення ў вытворчасць навуковай арганізацыі працы, непасрэдна ўдзельнічае ў распрацоўцы розных мерапрыемстваў, працуе, як кажуць, з маладым запалам, творчай энергіяй.

Трэба адзначыць, што гэтыя добрыя і так неабходныя навыкі здабываюцца ў паўсядзённай і напружанай працы, ва ўпартай вучобе, у пазнанні новага. Толькі ў такім разе інжынер можа апраўдаць сваё прызначэнне, будзе знаходзіцца ў першай шарэнзе змагароў за новае, перадавое.

Аднак асобныя спецыялісты падчас забываюць аб гэтым, падмяняюць творчую работу пісанінай, афармленнем дзелавых дакументаў, замыкаюцца ў вузкім коле справаздач, губляюць такім чынам непасрэдную сувязь з вытворчасцю, слаба ведаюць становішча спраў на месцах. Так, напрыклад, начальнік аддзела працы і зарплаты завода зборнага жалезабетону № 6 Л. І. Фомкін не заўсёды праяўляе неабходную ініцыятыву ў рабоце, слаба прапагандуе перадавыя метады ў арганізацыі працы людзей на прадпрыемстве. Без належнага энтузіязму, творчага ўздыму працуе і галоўны інжынер аўтабазы № 5 В. М. Вахоўскі.

Практыка паказвае, што там, дзе прыніжана патрабавальнасць да сябе, дзе забываюць, што інжынер —чалавек творчай думкі, наватар, ініцыятыва скоўваецца і глохне ў самым зародку. Інжынер не павінен дзейнічаць па прынцыпу: я працую як быццам бы нядрэнна, заўваг не маю, значыць абавязкі свае выконваю. Ці трэба гаварыць, як шкодна такое меркаванне для справы?

У радзе месц маладых здольных інжынераў загружваюць рознымі другараднымі работамі, не ствараюць ім умоў для поўнага раскрыцця сваіх якасцей, для ажыццяўлення задуманага. Інжынер — гэта чалавек, які ўмее выхадзіць, ствараць. Такім ён і павінен быць, гэты нястрымны шукальнік, здольны арганізатар. Партыйныя, прафсаюзныя арганізацыі, кіраўнікі прадпрыемстваў павінны дапамагчы яму стаць такім.